вучням і ў зніжэнні псіхічных і фізічных нагрузак. Настаўнік павінен не толькі выкладаць свой урок, але і захапляць дзяцей, тым самым ствараць глебу для лепшага ўспрымання вялікага і складанага матэрыялу.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Максімук, Н.М. Дыдактычныя гульні для шасцігодак. Метад. дапаможнік для настаўніка/ Н.М.Максімук. –Мінск: Нар.асвета, 1991.-44 с.
2. Солахаў, А.В. Падарожжа ад А да Я. Дапаможнік для настаўнікаў/ А.В.Солахаў. - Мінск: Зорны Верасок, 2012.-262 с.
3. Старжынская, Н.С. Сябруем і гуляем разам/ Н.С.Старжынская.-Мінск: Нар. асвета, 1994, 80 с.
4. Пачатковая школа.- 2006.-№6.- 60 с.

## АСНОВЫ ПРАЦЫ З ЗАГАДКАМІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

**Н. В. Аліева, настаўнік пачатковых класаў**

*ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. Пінска», г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

Зыходзячы з Канцэпцыі нацыянальнага выхавання, актуальнасці ідэалагічнай работы на сучасным этапе, адным з важнейшых прынцыпаў выхаваўчага працэсу з’яўляецца сацыяльна-культуралагічны, які вызначаецца прызнаннем і асэнсаваннем нацыянальна-культурных традыцый, адраджэннем і развіццем культуры свайго народа, фарміраваннем нацыянальнай самасвядомасці. Таму адна з важнейшых задач сенняшняй школы – выхаванне інтэлектуальна развітай, духоўна багатай, нацыянальна свядомай творчай асобы. Без вырашэння гэтай задачы немагчыма паспяхова ажыццявіць праграму нацыянальнага адраджэння, бо без ведання сваіх вытокаў немагчыма па-сапраўднаму палюбіць родны край, яго спадчыну, стаць патрыетам.

Вялікую ролю ў фарміраванні чалавека выконвае роднае слова. Таму важнай з'яўляецца праца па развіцці інтарэсу да беларускай спадчыны і яе моўных здабыткаў. Вывучэнне мудрых, вобразных народных афарызмаў ўзбагачае гаворку навучэнцаў, падвышае іх пісьменнасць, спрыяе выхаванню эстэтычнага густу. Разнастайная і цікавая праца з загадкамі не толькі прышчапляе навучэнцам любоў да вуснай творчасці, але і прымушае цікавіцца народнай мудрасцю. Да таго ж форма загадкі прыцягвае ўвагу дзяцей і робіць навучанне цікавым, ненадакучлівым.

Загадкі вызначаюцца мудрасцю, трапнасцю выразаў, афарыстычнасцю. Яны легка запамінаюцца, развіваюць фантазію, кемлівасць, дасціпнасць у дзяцей. Нярэдка загадкі маюць высокамастацкую форму і таму дапамагаюць уводзіць дзяцей у свет паэзіі і мастацтва. Апрача таго, у народных загадках, як і ў іншых фальклорных формах творчасці, адлюстраваны жыццевы вопыт беларускага народа. Загадка знаеміць з мінулым і сучасным людзей, дапамагае дзецям пазнаць свет.

Загадка – гэта тое ж пытанне, якім мы звычайна карыстаемся на занятках, толькі больш складанае. Метафарычнае. Яно прымушае дзіця думаць, распазнаваць прадметы па сходнасці ці рознасці, абагульняць з'явы, асацыіраваць.

Важнейшымі функцыямі загадак з'яўляюцца: праверка і трэніроўка кемлівасці дзяцей, развіцце іх лагічнага і паэтычнага мыслення, уменне пазнаць навакольную рэчаіснасць у іншасказальных вобразах. Нямалаважнымі з'яўляюцца таксама павучальная, выхаваўчая, пацяшальна-забаўляльная, гульневая функцыі і іншыя. Такім чынам, загадка як жанр поліфункцыянальная.

Змест загадак характарызуецца шматлікай тэматычнай разнастайнасцю, што абумоўліваецца іх сувяззю з жыццем і працай селяніна, яго гаспадаркай і бытам. Класіфікацыя і тэматычная сістэматызацыя загадак грунтоўна распрацавана А.І.Гурскім, які вылучыў пяць вялікіх традыцыйных груп загадак: «Прырода і чалавек», «Гаспадарка і матэрыяльны быт», «Грамадскі і

сямейны быт», «Культура», «Загадкі-жарты, загадкі-задачы». Асобна сістэматызаваў ен загадкі савецкага часу. Загадкі сустракаюцца ў вельмі даўніх казках і абрадавых песнях.

Дзецям неабходна прапанаваць разнастайныя загадкі, якія класіфікуюцца наступным чынам: «Тэматычныя загадкі» (пра чалавека, прыроду, жывел, гаспадарку, сямейны быт), «Загадкі-пытанні», «Загадкі-рыфмаванкі», «Загадкі-задачы». Прапаную адзін з варыянтаў работы над загадкамі на ўроку «Літаратурнага чытання» [12, с. 78].

Урок-гульня па тэме «Загадкі» (пазакласнае чытанне)

Мэта ўрока: удасканальваць уменні вучняў асэнсоўваць загадкі і адгадваць іх, звяртаючы ўвагу на арыгінальнасць формы, адметную будову, вобразны лад; даць уяўленне пра сучасныя літаратурныя загадкі; паўтарыць атрыманыя веды па вывучаным тэмам; выхоўваць цікавасць вучняў да духоўнай спадчыны.

Тып урока: урок-гульня.

Абсталяванне: вучэбны дапаможнік «Літаратурнае чытанне» для ІІІ класа частка І (аўтар М.В.Жуковіч), карткі з заданнямі.

Дыдактычны сцэнарый

Арганізацыйны момант.

Настаўнік агучвае тэму і мэты ўрока, стварае адпаведны настрой. На дошцы змешчаны дыдактычны матэрыял, прадстаўлена табліца з заданнямі.

Прадстаўленне каманд.

Капітаны прадстаўляюць свае каманды, агучваюць назвы каманд. У гульні ўдзельнічаюць 3 каманды.

Гульня

1. Размінка «Удалы жарт увагі варт»

Часопіс, які з'яўляецца пасля дажджу? (Вяселка)

Што называецца «беларускім шоўкам»? (Лен)

Які гасцінец нельга прывезці ў падарунак? (Гасцінец-дарогу)

Што знаходзіцца сярод ракі Сож? (Літара о)

2. Конкурс «Загадкі-адгадкі»

Кожнай камандзе выдадзены карткі, дзе запісаны па тры загадкі. За хвіліну трэба даць адказ.

Каманда 1.

1. Белы, як снег, салодкі, але не мед. (Цукар)

2. Ляціць, а не птушка, вые, а не звярушка. (Вецер)

3. У жываце лазня, у носе – рэшата, на галаве – пупок, адна ручка і тая на спіне. (Чайнік)

Каманда 2.

1. Вадкае, а не вада, белае, а не снег. (Малако)

2. На дварэ гарою, а ў хаце вадою. (Снег)

3. Фыркае, рыкае, галіны ламае, пыл падымае, цябе з ног збівае, чуеш яго, але не бачыш. (Вецер)

Каманда 3.

1. Носік жалезны, а хвосцік ільняны. (Іголка з ніткай)

2. Стукае, грукае, а нідзе не відаць. (Гром)

3. Мяне з дрэва наламалі, потым лыкам абвязалі, ну а я і не сумую ды па хаце ўсе танцую. (Венік)

3. «З легендаў і казак былых пакаленняў»

Аднаму прадстаўніку каманды неабходна расказаць легенду пра любы горад Беларусі.

4. «Усіх нас гадуюць матчыны казкі»

Скласці цытатны план казкі. Капітаны каманд цягнуць паперкі з назвамі казак («Залаты птах», «Музыкі», «Разумная дачка»).

5. «Брэйн-рынг»

На дошцы змешчана табліца, пад кожным нумарам напісана заданне. Нумар задання = колькасць балаў за правільны адказ:

| КАЗКІ | ЗАГАДКІ | ЛЕГЕНДЫ |
|---|---|---|

Назавіце тры віды казак. (Чарадзейныя, бытавыя, пра жывел)

Назавіце герояў казкі «Разумная дачка».

Пазнайце казку па ўрыўку.

Пачало на дзень займацца. Чуе Іван – нешта здалеку зашумела. Стаіўся ен, углядаецца. Аж бачыць – ляціць да яблыні чароўная птушка. Падляцела блізка, каб яблык схапіць, а Іван злаўчыўся ды цап яго за доўгі хвост!

ЗАГАДКІ

Стаіць паненачка ў чырвонай сукеначцы, хто ідзе – паклоніцца. (Суніцы)

Сівенькая, маленькая, а ўвесь свет абшывае. (Іголка)

Назавіце загадкі, якія загадаў пан у казцы «Разумная дачка».

ЛЕГЕНДЫ

Назавіце герояў легенды «Нарач».

Назавіце аўтара легенды «Нарач». (Аўтара няма, легенда народная)

Пазнайце легенду па ўрыўку:

Усе лета ахоўваў ен падкідыша, карміў, пеставаў малога, а неўзабаве і забраў яго з собой. А калі людзі, якія памяталі, як стары воўк пеставаў кінутае ваўчане, сталі непадалеку ад былога логавішча будавацца, то і вырашылі назваць веску….

Падвядзенне вынікаў гульні. Падлік балаў, аб’яўленне пераможцаў і выстаўленне адзнак.

Рэфлексія (праводзіцца па тэхніцы «Мора»).

Традыцыйныя загадкі  добра захаваліся і ў наш час. Ствараюцца яны і зараз, працягваюць выконваць многія з традыцыйных функцый, найбольш пазнаваўчую, навучальную, пацяшальную, гульневую, выпрабавальную (кемлівасці). Загадкі і зараз цікавяць не толькі дзяцей сваей дасціпнасцю, мудрагелістасцю, дасканаласцю мастацкай  формы, шырыней адлюстравання рэчаіснасці, а і дарослых, што і абумовіла іх папулярнасць у народзе.

Як вядома, ранні ўзрост з’яўляецца найбольш спрыяльным перыядам для фарміравання мовы дзіцяці. Мова – гэта матэрыяльнае выражэнне думкі, і дзіця толькі тады будзе ведаць яе, калі разам з сэнсам успрымае яркую эмацыянальную афарбоўку, жывое трымценне музыкі роднага слова. Таму

самы каштоўны матэрыял у гэтай справе – беларускі фальклор, вусна-паэтычная творчасць народа, у прыватнасці, загадка.

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Конан, У.М. Фальклор як мастацкая сістэма і яго актуалізацыя у адукацыі / У.М.Конан // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – № 7. – С. 60-66.

2. Алфёрава, А.Г. Роля загадак у педагагічна-выхаваўчым працэсе /А.Г.Алфёрава // Народная асвета. – 2004. – № 4. – С. 93-96.

3. Лепешаў, І. П. Пра паходжанне загадак / І.П.Лепешаў // Полымя. – 2007. – № 4. – С. 210-216.

4. Ражкова, Л.А. Да пытання аб педагагічным патэнцыяле фальклору / Л. А. Ражкова // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 3. – С.46-49.

5. Ташашэвіч, З.М. Наша родная мова. Вывучэнне загадак на уроках літаратурнага чытання /З.М.Ташашэвіч // Пачатковая школа. – 2006. – № 8. – С. 9-15.

6. Бурда, С.І. Фальклор у выхаванні маральных якасцей школьнікаў / С.І. Бурда // Пазашкольнае выхаванне. – 2008. – № 1. – С. 13-20.

7. Рапановіч, Я.Н. Беларускія прыказкі, скарагаворкі і загадкі / Я.Н.Рапановіч. – Мінск: Вышэйшая школа, 1994. – 384 с.

8. Сторажава, Н.А. Мова мая і твая. / Н.А.Сторажава. – Мінск: Выд. А.Ванін, 1993. – 80 с.

9. Чухрова, Л.В. Слова роднае, жывое, трапяткое. / Л.В. Чухрова // Пачатковая школа. – 1994. – № 9. – С. 23-25.